


# Час танцаваць

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўпершыню зладзіць баль "Бібліятэчнае лета". Свята для аматараў кніг, музыкі і танцаў адбудзецца заўтра.**

У галоўную кніжную скарбніцу краіны завітае больш за сотню падрыхтаваных танцораў з розных куткоў Беларусі. Сярод удзельнікаў — гурты Dancing time з Мінска, "Срэбраны век" з Гомеля, "Серпанцін" з Магілёва, "Паланэз" з Бабруйска ды іншыя. Спасцігнуць асновы харэаграфіі наведвальнікам прапануюць падчас майстар-класаў.

У зале беларускай літаратуры разгорнецца майстэрня рэстаўратара, у зале нотных і аўдыявізуальных дакументаў можна будзе паслухаць музыку на вінілавых пласцінках, а зала дакументаў па мастацтве запрашае на экскурсію па выставе, прысвечанай Эдгару Дэга. У галерэі "Лабірынт" запрацуе музычна-літаратурная гасцёўня. А бавіць час за шашкамі і шахматамі кліча "Гульнявы бальны салон". Там жа можна паўдзельнічаць у дэтэктыўных забавах "Шэрлак Холмс" і "Знікненне на французскім прыдворным балі XVIII стагоддзя".